стаўнікоў роду Тышкевічаў прымаюць розныя формы і змест у розныя гістарычныя перыяды. Адлюстраванне дынамікі дадзеных ідэнтычнасцей дазваляе вылучыць галоўныя фактары іх фарміравання: сацыяльнае паходжанне, род, рэлігія ў перыяд феадальнага ладу. Роля дзяржавы не мела вызначальнага ўплыву: трансляцыя і перадача культурнага вопыту ажыццяўлялася ў сваім сацыяльным асяродку праз лакальныя вертыкальныя і гарызантальныя сувязі. Палітычная лаяльнасць шляхты была скіравана, у першую чаргу, на асобу манарха, а не на дзяржаву. Сітуацыя канца XVIII – пачатку XIX ст. з нараджэннем нацыянальных рухаў, разбурэннем феадальнага ладу, буйных імперый выклікала крызіс былых этнакультурных ідэнтычнасцей: у межах аднаго пакалення адбылася карэнная ломка ўяўленняў аб сваіх культурных характарыстыках, што паспрыяла паўстанню нацыянальнай беларускай, літоўскай, польскай і ўкраінскай інтэлігенцый, далей народжаныя нацыянальныя ідэнтычнасці актыўна канструяваліся і падтрымліваліся дзяржавай.


1. *Калхун, Крейг.* Национализм / Крейг Калхун. – М. : Территория будущего, 2006. – 288 с.

2. *Сміт, Э. Д.* Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / Э. Д. Сміт. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 270 с.



А. М. НАРОЎСКАЯ


# СЕМІЁТЫКА КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ ЛАГОЙШЧЫНЫ

У міфалагічных тэкстах адзначаецца, што мадэль любога грамадства імкнецца знаходзіцца на тэрыторыі асвоенай і арганізаванай прасторы. Міфапаэтычны свет заўжды мае межы, якія надаюць яму ўстойлівасць і бяспеку. Чым больш маркіраваных кропак і межаў, тым больш асвоенай і структураванай з'яўляецца «свая» прастора. Тэрыторыя вёскі, мястэчка, на якой пражывала абшчына, звычайна мела свае межы – умоўныя альбо маркіраваныя прыдарожнымі крыжамі, камянямі альбо загароджаю. Гэтая прастора ўспрымалася як родная, «свая». Людзі добра ведалі межы сваёй тэрыторыі; за яе межамі пачы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наліся ўжо чужыя надзелы. Паводле Т. У. Ціўян, «…неабмежаванасць знешняга свету звязана з недакладнасцю, хаасам і небяспечная для чалавека; ён знаходзіць сабе абарону на невялікай, абмежаванай і таму кантраляванай прасторы хаты...» [9, с. 72], а таксама вёскі, паселішча. Падобнае ўспрыманне чалавекам навакольнага асяроддзя як лакальнага, «свайго» знайшло адлюстраванне ў лексіцы беларускага народа. Семантычнае поле можна бачыць у такіх значэннях як Радзіма, бацькаўшчына, «котлішча», «свая хата» і г. д.

Катэгорыі прасторы «свой – чужы» шырока выкарыстоўваюцца ў прыказках: «Добра на Доне, ды лепей у сваім доме» [6]. Катэгорыя блізкага рэалізуецца ў паняццях роднай хаты і, нават, частках яе інтэр’ера (печ, «свой агонь» і т. п.), падворка, вёскі, краю. «У сваёй хаце і качарга маці» [5, с. 504]. Катэгорыя чужога выяўляецца праз паняцці «старана, край, вёска»: «Чужая старана – цёмны лес», «Чужая хатка такая, як свякроўка ліхая» [6]. Такім чынам, акрэсліваючы прастору чалавека, прыказкі вызначаюць і месца для прадметнага раду, які яго акружае.

Кожная вёска, мястэчка, горад мелі пачатак і канец, якія ў большасці выпадкаў маркіраваліся сакральнымі прадметамі – крыжамі з аброчнымі ручнікамі, камянямі, брамамі. Найбольш зручным матэрыялам для «маркіроўкі» прасторы былі камяні. Да традыцыйных прасторавых каменных сімвалаў беларусаў адносіцца камень каля дарогі. Імі таксама адзначалі месцы раздарожжаў, паваротаў. Так, каля в. Меxеды Лагойскага раёну знаходзіцца валун, які жыхары лічаць свяшчэнным. У час Другой сусветнай вайны вёска была спалена. Пасля вайны ў час будаўнічых работ быў знойдзены валун, які паставілі на пачатку вёскі як сімвал.

Свяшчэнны Дажджбогаў камень знаходзіцца каля в. Крамно Лагойскага раёна. На яго паверхні ёсць некалькі лунак, падобных на адбіткі чалавечых ступакоў. Па звестках Зосі Рагач (85 гадоў, жыхарка в. Крамно), з даўніх часоў каля каменя знаходзілася крыніца са святой вадой, да якой прыходзілі да ўсходу сонца людзі з падарункамі – кветкамі, хлебам, яблыкамі, грашыма. Асабліва шмат людзей прыходзіла туды на Вялікдзень, Сёмуху, Івана Купалу. Каб вярнуць здароўе горстку вады налівалі ў лункі на камені («Божыя сляды») і потым ёй пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мывалі хворае месца. На думку жыхароў вёскі Крамно, ад каменя залежылі таксама ўраджай і дабрабыт мясцовых жыхароў.

Такім чынам, камень быў універсальным межавым сімвалам-знакам [7]. Другімі аб’ектамі, якія выкарыстоўваліся ў якасці маркера тэрыторыі, былі крыжы з рознага матэрыялу. Яны звычайна стаялі пры ўездзе і выездзе, а часам і ў цэнтры паселішча. Шмат такіх крыжоў знаходзіцца ў Мінскай вобласці (в. Мурожнае, Лагойскі раён, в. Палачаны і в. Раёўшчына, Маладзечанскі раён, в. Даўгінава, Вілейскі раён, в. Крывічы, Мядзельскі раён і інш.).

Прыдарожныя каменныя крыжы, як і драўляныя ставілі на перакрыжаваннях або каля дарог, межах зямель, пры закладцы гарадоў і храмаў, на могілках, ускрайках вёскі, каб абараніць іх ад эпідэмій і захопнікаў.

Своеасаблівую ахоўную мяжу ўстанаўлівалі розныя агароджы двароў, жылых пабудоў, палацаў, напрыклад, вакол палаца Тышкевічаў у Лагойску. Такія агароджы аддзялялі свет людзей ад свету прыроды, культурнае ад дзікага. Гэтыя месцы патрабавалі адпаведных паводзін і адносін да сябе, паколькі знаходзіліся на перыферыі асвоенай чалавекам прасторы. Агароджа з аднаго боку маркіравала «сваю» прастору, а з другога была максімальна набліжана да «чужой».

Своеасаблівую мяжу жыхары вёскі, мястэчка імкнуліся ўстанавіць у выпадку эпідэмій, войнаў. Пры дапамозе адпаведных рытуалаў чалавек жадаў зрабіць бяспечнай зону пражывання. Апатрапейную накіраванасць мелі такія формы калектыўнай абраднасці, як абворванне вёскі, хрэсны ход, тканне абыдзенніка і г. д. Да апатрапейных дзеянняў адносілася таксама абвядзенне магічнага круга вакол двара ў час падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Апатрапеямі лічыліся хлеб, вада, агонь, раса, зямля, валасы, зерне, пахкія расліны (цыбуля, часнок, мята, палын і інш.) [11, с. 33–34 ].

Абворванне вёскі, звязанае з эпідэміямі і хваробамі адносіцца да аказіянальных рытуалаў. Як адзначае А. Ф. Байбурын, прычына правядзення звязана з тым, што «чужыя» сілы парушылі мяжу. І рытуал накіраваны на тое, каб выкрыць увасабленне «чужога», якое прынесла няшчасце і адправіць яго назад. Абворванне вёскі здзяйснялася ў крытычныя моманты –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каля паўночы, на стыку старых і новых сутак. У ім прымалі ўдзел старухі і цнатлівыя дзяўчыны, каб дасягнуць чысціні правядзення рытуалу і ў той жа час смадэліраваць два света – стары і новы [2, с. 148–149].

Абворванне адбывалася альбо ў поўнай цішыні, альбо з шумам, лаянкай, каб прагнаць смерць. Гэты абрад з'яўляецца па сутнасці аднаўленнем дзеяння, якое адбывалася пры заснаванні паселішча, калі плугам абводзілі раллю, каб вылучыць «сваю» прастору для пражывання на ёй.

Другім варыянтам рытуальнага абнаўлення «свайго» з'яўляецца стварэнне звычайных рэчаў – палатна, рушнікоў [3]. Аброчныя тканіны звычайна выраблялі калектыўна за адзін дзень. Жанчыны збіраліся ў адным доме, кожная з іх прала па адной нітцы, ткалі сумесна палатно і наносілі арнамент. Аброчныя тканіны ахвяраваліся і завязваліся чалавекам па ўласным абраку і з індывідуальнай просьбай да Бога [8, с. 16]. Такія аброчныя рушнікі завязваліся на драўляныя крыжы, што стаялі ў вёсках, на абочынах ці на скрыжаваннях дарог, на могілках, на прошчы, каля святых крыніц, на «святыя дрэвы». Потым іх пачалі вешаць таксама на абразы ў цэрквах, касцёлах, капліцах. Такім чынам, звычайная рэч была ідэальна новай, чыстай, якая не паспела «састарыцца» ў працэсе вырабу. Аброчны рушнік станавіўся ўвасабленнем ідэі адноўленага жыцця, такога, якое было тады, калі не было хвароб і войнаў. Таму, калі адбываецца дэсеміятызацыя света, знікаюць межы паміж «сваім» і «чужым», калектыў і чалавек прымае адзінае правільнае рашэнне: стварае новую семіясферу. Чужое пачынаецца там, дзе заканчваецца сваё, і гэта мяжа падарожнічае разам з чалавекам. Гэта асабліва праяўляецца ў рытуалах, калі рэалізуецца схема пранікнення чалавека ў чужы свет. Напрыклад, трапленне жаніха ў дом нявесты, чужы для яго свет. Так, складаны абрад пераходу праз парог удзельнікаў вясельнага абраду зафіксаваны ў Мінскай губерні. Згодна этнаграфічным апісанням П. Шэйна: «У Барысаўскім павеце часам жаніха пускаюць мірам, а часам дружына жаніха выбівае дзверы хаты сілаю» [10, с. 156].

Такім чынам, свая зямля, вёска мела больш-менш выразна пазначаныя межы, па меры аддалення ад якіх, ад заселенай «сваімі» людзьмі прасторы вёскі, чалавек трапляў у «чужы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для яго свет. Даследчыкі правамерна адзначаюць, што для міфалагічнага мыслення характэрны прасторавыя ўяўленні з «унутранага пункту гледжання на прастору». Для насельніцтва кожнай вёскі менавіта свая тэрыторыя з'яўлялася семантычным цэнтрам, вакол якога будаваўся астатні свет. У адносінах да сваёй зямлі любая суседняя – ужо перыферыя, адпаведным было і стаўленне да суседніх вёсак. Асабліва блізка мяжа свайго падступае ў пахавальнай і памінальнай абраднасці, у час пахавання імкнуцца вывесці за межы дома, «свайго» ўсё, што закранута смерцю. Напрыклад, на могілкі труну неслі са шматлікімі прыпынкамі. Так, першы прыпынак на шляху «свайго» і «чужога» быў каля выхаду з жылля. Карскі Я. Ф. піша, што «звычайна прыпынак адбываецца каля дзвярэй з трохкратным стукам аб парог альбо аб вугал дома [4, с. 304]. Згодна архіўным матэрыялаў ІМЭФ НАН прыпынкі былі каля царквы, дарожнага крыжа... [1, с. 219].

Такім чынам, парог, брама, крыж пры канцы вёскі, мястэчка з'яўляліся мяжой, якая выконвала фільтруючыя функцыі, аддзяляла асвоеную ад неасвоенай прасторы і перашкаджала пранікненню небяспечных сіл у «акультураную» прастору.


*1.* Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 894. Арк. 290.

*2. Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин. – СПб., 1993. – С. 148–149.

*3. Зеленин, Д. К.* «Обыденные» полотенца и обыденные храмы (русские народные обычаи) / Д. К. Зеленин // Живые страницы. – СПб. : Тип. Императорской Академии Наук – 1911, вып. 1. № 2.

*4. Карский, Е. Ф.* Белорусы. Т. 3. Очерки словесности белорусского племени. 1. Народная поэзия / Е. Ф. Карский. – М., 1916. – С. 304.

*5. Лепешаў, І. Я.* Тлумачальны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Гродна, 2011. – С. 545.

*6. Рапановіч, Я. Н.* Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Я. Н. Рапановіч. – 2-е выд., дап. і перапр. – Мінск, 1974. – С. 384.

*7. Сардараў, А.* Камень у прасторавым асяроддзі / А. Сардараў // Архитектура и строительство. 2010. № 7.

*8. Фадзеева, В. Я.* Аброчныя тканіны / В. Я. Фадзеева // Этнаграфія беларусаў : энцыкл. – Мінск, 1989. – С. 16.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Цивьян, Т. В.* «Дом» в фольклорной модели мира (на материале балканских загадок) / Т. В. Цивьян // Труды по знаковым системам 10. – Тарту, 1978. – С. 72.
10. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. / П. В. Шейн. – СПб., 1902. – С. 156.
11. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэд. І. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1989. – С. 33–34.

М. М. САКАЛОЎСКАЯ

## ТВОРЧАЕ ПАРТНЁРСТВА ФЛАРЫЯНА МІЛАДОЎСКАГА І БЕНЯДЗІКТА ТЫШКЕВІЧА

Дабратворны ўплыў мецэнацкай дзейнасці графа Б. Э. Тышкевіча адчуў беларускі кампазітар Фларыян Фабіянавіч Міладоўскі (1819–1889), які па праву лічыцца адным з заснавальнікаў айчыннай прафесійнай музычнай культуры. Бацька Фларыяна, шляхціч Фабіян, валодаў фальваркам Навадворкі каля Навагрудка, але з цягам часу страціў уладанне і быў вымушаны перабрацца ў Мінск і зарабляць грошы ўрокамі музыкі [2]. Тут і нарадзіўся будучы знакаміты кампазітар. Бацька, заўважыўшы здольнасці сына да музыкі, пачаў фарміраваць у яго навыкі музычнай граматы і ўменні фартэпіяннай ігры. Далейшае развіццё музычнага майстэрства адбывалася ў Вільні пад кіраўніцтвам вядомага педагога-піяніста Фердынанда Цібэ. Вучоба ў Цібэ прынесла шмат карысці Фларыяну, аб чым сведчыць першы публічны канцэрт, які ў маі 1829 г. у Вільні даў дзесяцігадовы піяніст. У праграме канцэрта былі складаныя музычныя творы: Сёмы канцэрт для фартэпіяна Д. Г. Штэйбельта і Варыяцыі К. Чэрні. Тагачасная прэса адзначыла, што ў ігры юнага музыканта адчуваліся вялікія здольнасці, незвычайная смеласць, прысутнасць духу, дакладнасць рытму, бегласць і пачуццё [3]. У віленскі перыяд у Ф. Міладоўскага праявіўся і кампазітарскі талент. Яго мазуркі, вальсы, паланэзы, контрадансы, мініяцюры карысталіся вялікай папулярнасцю ў колах творчай эліты Віленшчыны.

Бацька, які пільна сачыў за поспехамі сына, зразумеў, што Фларыян ужо пераўзышоў свайго настаўніка. Для далейшага развіцця яго музычных здольнасцей патрэбен больш вопытны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ